ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 18 (880) | Аўторак, 29 лістапада 1994г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Міжнародныя сувязі

## ПЕРАЙШЛІ ДА КАНКРЭТНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Прайшло больш года, як устаноўлены, падтрымліваюцца і паглыбляюцца двухбаковыя сувязі паміж Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.Скарыны і прафесіяналізаваным інстытутам "Інжынерынг менеджмента" Оверньскага універсітэта, які знаходзіцца ў горадзе-пабрацiме Клермон-Феран. Дастаткова сказаць, што французскія дэлегацыі сёлета ўжо ў трэці раз наведалі горад над Сожам. Апошнюю, як і дзве папярэднія, узначальваў дырэктар названага інстытута прафесар Морыс Шэневуа. На гэты раз у дэлегацыю ўваходзіла шэсць чалавек.

У ГДУ сумесна з яго кіраўніцтвам французскія калегі выканалі значную работу па канкрэтызацыі праектаў міжнароднай праграмы "Тэмпус", пасля чаго быў падпісаны адпаведны кантракт. Згодна з ім, ужо ў бягучым навучальным годзе нашаму універсітэту выдзяляецца для асваення прынятай праграмы 55 тыс. долараў, з якіх 10 тыс. -- на абсталяванне.

Рэктара Л.А.Шамяткова, першага прарэктара прафесара М.В.Селькіна і прафесара Морыса Шэневуа прыняў старшыня Гомельскага аблвыканкома М.Р.Вайцянкоў. У час сустрэчы адбылася канструктыўная размова аб некаторых выніках праведзенай работы, аб шляхах далейшай стабілізацыі двухбаковага супрацоўніцтва ў розных накірунках. Тут спатрэбіцца і дапамога абласнога выканаўчага камітэта. Адобрыўшы ўжо дасягнутае, М.Р.Вайцянкоў паабяцаў аказваць усямернае садзеянне ў рэалізацыі вызначанай праграмы.

Прадстаўнікі французскай дэлегацыі мелі сустрэчу ў Гомельскім гарвыканкоме. Тут разгледжана шырокае кола пытанняў па далейшаму ўмацаванню супрацоўніцтва мэрый гарадоў-пабрацімаў.

Чатырохдзённае знаходжанне французскіх сяброў у Гомелі аказалася вельмі плённым і карысным.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## ПРАЦЯГВАЮЦЬ ВУЧОБУ Ў КЛЕРМОН-ФЕРАНЕ

У адпаведнасці з падпісаным пагадненнем паміж нашым універсітэтам і інстытутам "Інжынерынг менеджмента" Оверньскага універсітэта, пачынаючы з бягучага навучальнага года, прадугледжаны ўзаемаабмен студэнтамі для працягу вучобы. Тры студэнты эканамічнага факультэта ГДУ набываюць ужо веды ў Францыі. Гэта -- пяцікурсніцы спецыяльнасці "Эканоміка і сацыялогія працы" Наталля Гурачэўская і Алена Жосткая, чацвёртакурснік спецыяльнасці "Эканамічная інфарматыка і АСК" Аляксандр Вамбрыкаў. Паехаць для іх на вучобу ў замежную вышэйшую навучальную ўстанову было справай няпростай. Спатрэбіліся выдатнае веданне французскай мовы, а таксама дысцыплін, якія вывучаліся імі ў ГДУ. Адбор вёўся на конкурснай аснове камісіяй названага вышэй інстытута на чале з яго дырэктарам прафесарам Морысам Шэневуа. Дарэчы, у час свайго нядаўняга знаходжання ў нашым універсітэце ён расказаў, што гомельскім студэнтам для плённай вучобы і добрага адпачынку створаны ў Клермон-Феране самыя спрыяльныя ўмовы.

## ПА ПРАГРАМЕ "ТЭМПУС"

У першай дэкадзе наступнага месяца ў французскім горадзе-пабрацiме Клермон-Феран на працягу тыдня будзе працаваць семінар па міжнароднай праграме "Тэмпус". Ад нашага універсітэта ў ім прымуць удзел рэктар акадэмік Л.А.Шамяткоў, першы прарэктар прафесар М.В.Селькін, дэкан факультэта падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ дацэнт А.У.Гаўрылюк. Сумесна з кіраўнікамі Бірмінгемскага /Англія/, Оверньскага /Францыя/ універсітэтаў, вышэйшай школы г.Кіль /Германія/, іншымі зацікаўленымі прадстаўнікамі яны абмяркуюць першыя вынікі ажыццяўлення гэтай важнай праграмы, вызначаць поле дзейнасці на наступнае паўгоддзе і больш аддаленую перспектыву, прымуць адпаведныя дакументы.

## З ПРАФЕСІЯНАЛКАМІ ЗМАГАЦЦА ЦЯЖКА

Жаночая каманда па ручному мячу "ВВВ-Універсітэт" правяла дзве сустрэчы 1/8 фінала Еўрапейскага Кубка кубкаў з германскай камандай "Барусія" /Дортмунд/ на пляцоўцы саперніц. Абодва паядынкі закончыліся перамогай нашых саперніц адпаведна з лікам 29:18 і 36:23. Нашым дзяўчатам з прафесіянальнымі спартсменкамі, якія маюць багаты міжнародны вопыт, пакуль што змагацца цяжка.

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**


- 1. Выдзелена 55 тыс. долараў.
- 2. Аб праблемах студэнцкіх.
- 3. З савета універсітэта. Прафсаюзнае жыццё.
- 4. Таленты маладых.
- 5. Пасляслоўе да фестывалю "Арт-сесія".
- 6. Арыенціры па вывучэнню гісторыі Беларусі.
- 7. Аб творчасці любімых груп.
- 8. СНІДу -- стоп !

# "СТУДЭНТЫ -- ДЫЯЛОГ -- БУДУЧЫНЯ"

Пад такой назвай у сярэдзіне лістапада ў г.Віцебску прайшоў рэспубліканскі семінар прадстаўнікоў грамадскіх фарміраванняў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. У ім прынялі ўдзел таксама зацікаўленыя работнікі Міністэрства адукацыі і навукі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, галіновых прафсаюзаў, прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх фарміраванняў краін СНД і далёкага замежжа.

Яго арганізатарам сталі Асацыяцыя студэнтаў ВНУ Віцебскай вобласці, Асацыяцыя прафсаюзных арганізацый студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў нашай рэспублікі.

У праграму семінара ўвайшлі дыялог-канферэнцыя па пытаннях рэформы ў сістэме адукацыі, ролі студэнцкіх грамадскіх фарміраванняў у гэтым працэсе. Актуальныя праблемы моладзі на сучасным этапе абмеркаваны таксама на секцыях семінара "Студэнцтва і эканоміка", "Маладзёжная палітыка", "Нацыянальная культура", "Студэнцтва і дзяржаўная маладзёжная палітыка", "Нацыянальная культура".

Семінар садзейнічаў устанаўленню пастаяннага дыялогу паміж грамадскімі арганізацыямі студэнтаў, навучэнцаў і органамі кіравання дзяржаўнай улады, выпрацоўцы канкрэтных прапаноў па ўдзелу грамадскіх фарміраванняў у рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, каардынацыі іх дзейнасці ў рамках міжнароднага маладзёжнага руху.

На ім былі распрацаваны праекты дакументаў /публікуюцца ніжэй/, якія прапаноўваюцца для абмеркавання і студэнтам нашага універсітэта.

Удзельнікам семінара была прапанавана цікавая культурна-забаўляльная праграма.

**Я.ПЫШНЯК, нам.старшыні прафкома студэнтаў ГДУ, удзельнік семінара.**

## ОРГАНАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ І КІРАВАННЯ

Мы, удзельнікі форума грамадскіх фарміраванняў ВНУ, СНУ Беларусі ўпэўнены, што галоўнай умовай прагрэсу з'яўляецца фарміраванне інтэлектуальнага патэнцыялу рэспублікі. Сацыяльна-эканамічны крызіс у грамадстве ўсё больш паглыбляецца, знізіўся прэстыж вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, страчваецца імкненне моладзі да адукацыі і самаўдасканалення. Незадаволенасць дзеяннямі кіраўніцтва па ахове правоў студэнтаў і навучэнцаў вядзе да пратэстаў навучэнцкай моладзі, якія пакуль яшчэ не выліліся ў арганізаваныя забастоўкі, галадоўкі і мітынгі пратэстаў.

Удзельнікі студэнцкага форума прызнаюць неабходнасць распрацоўкі і ажыццяўлення новай дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і прыняцця ў яе рамках рашэнняў, накіраваных на абарону правоў навучэнцкай моладзі, што для стабілізацыі становішча неабходна неадкладна ажыццявіць рад першачарговых мер:

**1. Заканадаўча замацаваць прававы статус студэнтаў і навучэнцаў у грамадстве.**

**2. Пры фарміраванні дзяржаўнага бюджэту прадугледзець выдзяленне сродкаў на адукацыю ў размеры 14% ад нацыянальнага даходу.**

3. Стварыць у кожнай навучальнай установе фонд сацыяльнай абароны студэнтаў і навучэнцаў у памеры 5% стыпендыяльнага фонду за кошт дадатковых бюджэтных асігнаванняў.

4. Прадугледзець выдзяленне вышэйшым і сярэднім спецыяльным навучальным установам дадатковых сродкаў у аб'ёме месячнага стыпендыяльнага фонду адпаведнай навучальнай установы для арганізацыі культурна-масавай, спартыўна-аздараўленчай работы і адпачынку студэнтаў.

5. Улічваючы складанае экалагічнае становішча ў рэспубліцы /аварыя на ЧАЭС/, неабходна захаваць існуючую сетку студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў, структуру студэнцкага медыцынскага абслугоўвання, якія забяспечаць тым самым магчымасць аздараўлення моладзі.

6. Ажыццявіць праз сістэму дзяржзаказу прыярытэтнае будаўніцтва аб'ектаў адукацыі, вучэбных карпусоў, студэнцкіх інтэрнатаў, лячэбна-прафілактычных і аздараўленча-спартыўных устаноў.

7. Вырашыць пытанне аб пашырэнні тэрмінаў для навучэнцкай моладзі скідкі па тарыфу на праезд да месца вучобы і назад прыгарадным, міжгародным і аўтамабільным транспартам.

Клопат аб інтэлектуальным развіцці нацыі патрабуе змянення адносін парламента і кіраўніцтва рэспублікі да сістэмы адукацыі і навучэнцкай моладзі. Далейшае праманруджванне з вырашэннем гэтых пытанняў прывядзе да вялікіх страт, да зніжэння культурнага росту нацыі.

## ЗВАРОТ

**студэнцкага форума грамадскіх фарміраванняў ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі да навучэнцкай моладзі Беларусі.**

Мы, удзельнікі форума грамадскіх фарміраванняў ВНУ і СНУ Рэспублікі Беларусь, звяртаемся да ўсёй навучэнцкай моладзі Беларусі, да тых, ад каго заўтра будзе залежыць паслядоўнасць, глыбіня і маштабнасць працэсаў, якія адбываюцца ў нашым грамадстве, яго палітычнае і эканамічнае станаўленне. Сітуацыя ў грамадстве, у эканоміцы рэспублікі, сацыяльнай сферы ўказвае на тое, што толькі кансалідацыя дзеянняў грамадзянскай супольнасці прывядзе да стабілізацыі і прагрэсу. Важную ролю ў гэтым працэсе павінна адыграць маладзёжная палітыка ў выкананні грамадскіх фарміраванняў ВНУ і СНУ рэспублікі, накіраваная на:

-- ахову сацыяльна-эканамічных і прававых інтарэсаў студэнтаў і навучэнцаў;

-- садзеянне рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь;

-- узмацненне кантролю за выкананнем нарматыўных актаў, якія датычацца навучання студэнтаў і навучэнцаў, іх сацыяльна-эканамічных, жыллёва-бытавых і іншых пытанняў;

-- удзел у аналізе і абмеркаванні законапраектаў і падзаконных актаў, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы студэнтаў і навучэнцаў, што рыхтуюцца да разгляду ў органах дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь;

-- арганізацыю і ўдзел у мерапрыемствах па вылучэнню і падтрымцы кандыдатаў у дэпутаты органаў дзяржаўнай улады, якія выражаюць інтарэсы навучэнцкай моладзі.



# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У мінулы чацвер адбылося лістападаўскае пасяджэнне савета універсітэта. Па дакладу адказнага сакратара прыёмнай камісіі прафесара Д.Р.Ліна зацверджаны праект правіл прыёму студэнтаў у 1995 годдзе.

Заслухана і абмеркавана справаздача дэкана біялагічнага факультэта дацэнта С.Ф.Алешкі аб рабоце па падрыхтоўцы на біяфаку навукова-педагагічных кадраў.

Па інфармацыі загадчыцы аспірантуры Т.А.Скрынічэнка найбольш вопытным кандыдатам навук дазволена кіраўніцтва аспірантамі.

Аб выніках работы спартклуба універсітэта далажыў яго дырэктар Д.М.Жаркоў. Калі гаварыць аб дасягненнях ГДУ ў гэтым напрамку, яны не выклікаюць нараканняў. Аднак заслуга ў гэтым не спартклуба, а асобных трэнераў. А вось масавыя фізкультура і спорт сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў за апошнія гады прыкметна пагоршыліся. Універсіяда студэнтаў праводзіцца ўсё па меншай колькасці відаў. Спартакіяда ж "Здароўе" сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў па сутнасці замарнела.

Не праводзяцца пасяджэнні спартклуба, яго справаздачы на канферэнцыях. Не падводзяцца вынікі па вызначэнню лепшых спартсменаў і трэнераў года і інш.

На савеце разгледжаны кадравыя пытанні. На вакантныя пасады загадчыкаў кафедр абраны: агульнай фізікі -- доктар тэхнічных навук, прафесар **Д.Р.Лін,** геафізікі -- кандыдат геолага-мінералагічных навук, прафесар **А.П.Пінчук.** Прафесарам кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі на новы тэрмін абраны доктар геолага-мінералагічных навук **Г.А.Кузняцоў**. На вакантныя пасады дацэнтаў абраны: **А.П.Цыбіна** -- па кафедры эканамічных тэорый, **І.І.Кобыш, А.І.Цімашэнка** -- па кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, **І.М.Акулаў** -- па кафедры англійскай мовы, **А.У.Гаўрылюк** -- па кафедры матэматычнага аналізу, **Г.А.Аляксейчанка** -- па кафедры ўсходнеславянскіх народаў. На пасады старшых выкладчыкаў абраны: **І.М.Ахраменка** -- па кафедры оптыкі, **С.П.Емяльянава** -- па кафедры рускай літаратуры.

Савет універсітэта прыняў рэкамендацыі Атэстацыйнай калегіі Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь аб прысваенні вучонага звання прафесар доктару тэхнічных навук з кафедры ВМ і праграміравання **В.В. Мажароўскаму**, доктару фізіка-матэматычных навук з кафедры вышэйшай матэматыкі **Ю.У.Малінкоўскаму**, звання дацэнт --- кандыдату фізіка-матэматычных навук **А.В.Бузланаву** з кафедры алгебры і геаметрыі.

# РАЗГЛЕДЖАНЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ

Адбылося першае пасяджэнне прафсаюзнага камітэта, выбранага на справаздачна-выбарнай канферэнцыі 31 кастрычніка г.г. Зацверджаны яго пастаянныя камісіі.

*Культурна-масавая:*

**Лісоўскі В.В.**-- старшыня, **Калтышава Н.І., Панцялеева С.М., Варапаева В.В.**

*Сацыяльнага страхавання:*

**Варатніцкі Г.І.** -- старшыня, **Ігнатава М.У., Валчкова Т.А., Залатых С.А., Азяўчыкава А.У.**

*Аховы працы і тэхнікі бяспекі:*

**Стрыжнёў У.С.** -- старшыня, **Жулькоў В.І., Гадлеўская А.М., Елісеева І.М.**

*Жыллёва-бытавая і па дачных пытаннях:*

**Грыгарук П.Д.** -- старшыня, **Косцікаў А.А., Краўчанка А.Г.**

*Арганізацыйна-масавая:*

**Мярэжа В.Л.** -- старшыня, **Добшыкава Т.Г., Краснова А.М., Вішанкова А.А.**

*Камісія грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства аб працы:*

**Сарвіраў У.Б.** -- старшыня, **Рычкоў А.Я., Дрынеўская Н.Г., Балога У.П., Вайцішкіна А.Л.**

На гэтым жа пасяджэнні прафкома старшынёй рэвізійнай камісіі абраны дацэнт кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці **І.К.Кекіш.**

Было заслухана і абмеркавана паведамленне галоўнага ўрача універсітэцкага санаторыя-прафілакторыя С.А.Залатых аб аздараўленні выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнцкай моладзі, а таксама разгледжаны пастуліўшыя ў прафком заявы.

# ПРАФСАЮЗНЫ КАМІТЭТ СТУДЭНТАЎ

**Колтышава Н.І.** -- старшыня, **Пышняк Я.В.** -- намеснік.

*Старшыні прафсаюзных бюро факультэтаў:*

**Аўдзеенка Андрэй** -- гісторыка-юрыдычны факультэт, гр. ГА-41.

**Айвазбалян Аганэс** -- філалагічны ф-т, гр. Р-32.

**Багданава Кацярына** -- эканамічны ф-т, гр. БУ-33.

**Сурма Святлана** -- матэматычны ф-т, гр. М-42.

**Меляневўскі Уладзімір** -- геолага-геаграфічны ф-т, гр. ГФ-41.

**Кабялка Вольга** -- факультэт фізічнай культуры, гр. ФК-31.

**Савіцкая Галіна** -- біялагічны ф-т, гр. Б-21.

**Сухоцкі Пётр** -- фізічны ф-т, гр. Ф-33.

*Камісіі:*

*Арганізацыйна-масавая:*

**Пышняк Я.** -- старшыня, **Бібік Т.** /гр. Б-21/, **Капінская Л.** /гр. Р-21/.

*Культурна-масавая:*

**Прысяжны І.** /гр. ГА-41/ -- старшыня, **Кузьмянкова А.** /гр. ЭІ-31/, **Біран С.** /гр.ГР-32/, **Біран Ж.** /ГА-11/.

*Па кантролю за харчаваннем:*

**Гурыновіч І.** /гр.М-42/ -- старшыня, **Шэвелева В.** /гр. М-12/, **Сарока Т.** /гр. Ф-13/, **Зелянкова Н.** /гр. Ф-13/.

*Сацыяльнага страхавання:*

**Колтышава Н.І.** -- старшыня, **Зубікава Н.** /гр.Б-21/, **Базекін А.** /гр. БУ-22/.

*Спартыўна-масавая:*

**Вайцішкін В.** /гр. ФК-22/.



# ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ -- ВЫСОКІ

## ДА ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ "АНУ, ПЕРШАКУРСНІК!"

Калі заканчваюць вучобу ва універсітэце пятыя курсы, студэнцкі клуб з нецярпеннем чакае правядзення конкурсу "Ану, першакурснік!" Менавіта ён, як лакмусавая паперка, выяўляе настрой у рабоце па арганізацыі адпачынку на наступныя гады. 1994-95 навучальны год апраўдаў усе нашыя чаканні.

Каб сябе паказаць і на іншых паглядзець, конкурс гэтага года быў уключаны ў праграму 1-га Міжнароднага фестывалю моладзі "Арт-сесія". І, як нам здаецца, першакурснікі гэту творчую сесію здалі на "добра" і "выдатна". Хтосьці быў вышэй па ўзроўню, больш арганізаваны, хтосьці ніжэй, але ўсе аказаліся музычныя, знаходлівыя, танцуючыя. Адно толькі тое, што праграмы былі прадстаўлены як паэмы, лісты, проза і даведзены да лагічнага канца, гаварыла аб небесшабашнай падрыхтоўцы, а сур"ёзным падыходзе да справы. Але на гэтым і трымаецца немалаважная работа акрамя вучобы, так і захоўваюцца традыцыі. Я, ад імя першакурснікаў, гавару дзякуй Святлане Біран, Жане Вярэніч, Алене Маціеўскай, Аляксандру Балсуноўскаму, Алене Карымавай, Ірыне Каракінай /геолага-геаграфічны факультэт/; Івану Прысяжнаму, Наталлі Пархуціч, Аксане Гаўрыленка, Аляксею Яшчанку, Андрэю Сыцько, Дзмітрыю Шэйко, Алене Белакурай і Ірыне Шаблінскай /гісторыка-юрыдычны факультэт/; Валерыю Трафімовічу, Алене Кузьмянковай, Дзмітрыю Бычэнку, Юрыю Кавалёву, Галіне Падрэзенка /эканамічны факультэт/; Іллі Элькіну, Глебу Дзеравянку, Варвары Каменскай, Сяргею Марозу, Галіне Корзун /філалагічны факультэт/; Валерыю Мельнікаву, Мікалаю Рыжову, Аляксею Паўлаву /фізічны факультэт/; Ігару Саўчанку, /матэматычны факультэт/; Вячаславу Дарошчанку /біялагічны факультэт/.



Вынікам іх затрачаных сіл і эмоцый сумесна з першакурснікамі і быў 6 лістапада агульнауніверсітэцкі конкурс "Ану, першакурснік!"-94.

Аднадушнаму журы, упершыню за апошнія гады, не давялося шмат гаварыць і спрачацца, а толькі дзяліцца ўражаннямі і вызначаць пераможцаў і лаўрэатаў. Дарэчы сказаць, усе ўзнагароджаныя акрамя прызоў, атрымалі дыпломы лаўрэатаў 1-га МФМ "Арт-сесія" за высокае выканаўчае майстэрства. Ці гэта не памяць аб студэнцкіх гадах! А лаўрэатаў глядзельная зала запамятае, як і не забудуць апладысментаў у свой адрас Жана Біран, Віталь Казаннік і Сяргей Юдзіцкі /гісторыка-юрыдычны факультэт/; Вольга і Наталля Сідаравы, Андрэй Аўсеенка /эканамічны факультэт/; Віктар Калмагораў і Віталь Сокал /геолага-геаграфічны факультэт/; Таццяна Зуева /філалагічны факультэт/; Максім Мядзведзеў /фізічны факультэт/; Таццяна Турко /матфак/; Вольга Грамыка /факультэт фізічнай культуры/; Вольга Краўчанка /біяфак/.

Яшчэ адно, аб чым нельга не сказаць, як аб доўтачаканай падзеі. Зала зноў /пасля вельмі доўтага маўчання/ апладыравала студэнтам геолага-геаграфічнага факультэта, якія пацвердзілі сваё ўменне і жаданне быць не толькі ў ліку гледачоў, але і непасрэдных удзельнікаў на сцэне. Будучыя географы і геолагі даказалі сваё права на існаванне ў авангардзе студэнцкага жыцця не толькі ў вучобе, але і ў цікавай кругаверці творчасці.

Дзякуй яшчэ раз старшакурснікам і "першаклашкам", якія сталі надзеяй і гонарам факультэта і універсітэта, і занялі ў сваім першым конкурсе адразу прызавое трэцяе месца.

А месцы "першакурсніка" гэтага года размеркаваліся так: першае ўжо трэці год запар заслужана занялі студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта; другое -- будучыя эканамісты; на трэцім -- геолага-геаграфічны факультэт. Далей: філалагічны, фізічны, матэматычны, факультэт фізічнай культуры. Біялагічны факультэт, які паказаў нядрэнную праграму факультэцкага конкурсу, не змог, на жаль, прадставіць выступлен[не] на агульнауніверсітэцкай сцэне. Але патэнцыял ёсць, а значыць наперадзе -- чатыры з паловай гады для ўдзелу і перамог.

Па традыцыі агульнауніверсітэцкі конкурс "Ану, першакурснік!" 1994-95 навучальнага года завяршыўся ўзнагароджаннем і паказам пародый удзельнікамі і, не стрымаўшыхся ад магчымасці пазабаўляцца, работнікамі студэнцкага культурнага цэнтра ГДУ імя Ф.Скарыны. І яшчэ адным падарункам у канцы гэтага, напоўненага творчасцю дня стала выступленне ўдзельнікаў фесты[ва]валю "Арт-сесія. Гомель-94" -- тэатра танца "Заповіт" Харкаўскага дзяржаўнага інстытута культуры, кіраўнік -- заслужаны работнік культуры Украіны Барыс Калнагузенка.

Што ж?! Чакаем цябе, "Ану, першакурснік!" 1995 года!

**М.ШЫРЫНКІНА,**
**мастацкі кіраўнік культурнага цэнтра.**

**На здымку: фрагмент з праграмы пераможцаў конкурсу гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

**Фота У.Чысціка.**



# АДЗНАЧАНЫ ПА ЗАСЛУГАХ

Ва універсітэце яшчэ ёсць нямала людзей, ўсё працоўнае жыццё якіх звязана з нашай ВНУ. Да такіх адносіцца і старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання Венядзікт Венядзіктавіч Лісоўскі. Па заканчэнні факультэта фізічнага выхавання былога Гомельскага педінстытута імя В.П.Чкалава, ён пачаў тут жа выкладчыцкую працу. Аматары спорту ведаюць яго як здольнага фехтавальшчыка, былога чэмпіёна СССР, майстра спорту. В.В.Лісоўскі за шматлікія гады сваёй трэнерскай дзейнасці падрыхтаваў звыш 20-ці майстроў спорту па фехтаванню. За дасягнутыя поспехі ён удастоены ганаровага звання заслужанага трэнера Беларусі.

За шматгадовую плённую педагагічную дзейнасць па падрыхтоўцы спецыялістаў фізічнай культуры і спартсменаў высокага класа па фехтаванню В.В.Лісоўскі днямі ўзнагароджаны ганаровай граматай універсітэта. З гэтай нагоды яго цёпла павіншавалі калектыў кафедры, калегі, былыя выпускнікі і цяперашнія студэнты.

# "-- "АРТ-СЕСІЯ" ? -- ЗАЛІК !!!"

Штаб 1-га Міжнароднага фестывалю моладзі "Арт-сесія" дзверы сваіх аўдыторый не зачыняў ужо з сярэдзіны верасня. А калі рэкламныя афішы з"явіліся ў горадзе, свае паслугі сталі прапаноўваць не толькі жадаючыя дапамагчы прызамі і пасільна фінансава, але і сваёй бясплатнай працай.

У свой час, калі на заклікі грамадскіх арганізацый адгукаліся энтузіясты, іх называлі добраахвотнікамі, якія часам, "не щадя сил и живота своего", дзень і ноч працавалі, праяўлялі ініцыятыву, творча падыходзілі да любой справы. Для іх не існавала такіх слоў як "не хачу", "не магу", "не буду", "не ўмею". Яны не чулі ў свой адрас выразаў накшталт "прымусім", "абавяжам", "павінен", "не маеш права". Усё рабілася разам, і ў рабоце яны станавіліся аднадумцамі.

Сённяшняе наша жыццё патрабуе пастаянна чагосьці новага. Асобныя словы сталі насіць зусім іншы сэнс. Так, людзей, якія добраахвотна бяруць на сябе якую-небудзь работу, раней называлі добраахвотнікамі, а цяпер, крыху змяніўшы сваё значэнне, іх называюць валанцёрамі. Аб валанцёрах МФМ "Арт-сесія" я і хачу расказаць.



Іх было сямёра. І з"явіліся яны ў аргкамітэце адначасова, без спецыяльных запрашэнняў.

Калі ішла падрыхтоўка да фестывалю, у аўдыторыі клуба заглядвалі людзі, словам якіх мы былі вельмі рады: "Магу чым-небудзь дапамагчы. Давайце заданні". І разносілі пісьмы, дакументы, важныя паперы; раскладвалі атрыбутыку, білеты; афармлялі залу ў фае; цяжару перацягалі столькі, што можна ставіць залік па фізічнай культуры, як падаючым надзеі цяжкаатлетам. А яшчэ нялёгкая праца памочнікаў рэжысёра, дзе неабходны цярпенне, навык і пастаянная ўвага на рэпетыцыях і на саміх штодзённых праграмах.

Вось у такім рытме ў час падрыхтоўкі, а затым усе сем дзён фестывалю працавалі валанцёры Вячаслаў Дарошчанка і Алена Кузьмянкова, Андрэй Сыцько і Галіна Корзун, Андрэй Аляксеенкаў і Марына Рыдкіна, Аляксей Яшчанка /на здымку/. Большасць з іх -- студэнты розных факультэтаў ГДУ, нехта выпускнік, які ведае гэтую "кухню" яшчэ па студэнцкіх гадах, і тыя, хто непасрэдна мае адносіны да творчасці універсітэцкіх калектываў, не з"яўляючыся студэнтам нашай ВНУ.

Кажуць, каб зразумець дружбу, трэба "з"есці пуд солі". А я вам так скажу -- гэтая "соль" выходзіла праз пот стомленасці і слёзы радасці, успаміналася, калі недасыпалі і забываліся пра ежу, калі стараліся рабіць усё на належным узроўні, каб гледачу быў бачны чыставік фестывалю.

Дзякуй вам, валанцёры, хто прыйшоў у сябе ад стомленасці і ўсміхнуўся фатографу ў аб"ектыў пасля закрыцця МФМ "Арт-сесія". Аргкамітэт фестывалю вельмі ўдзячны вам і смела заяўляе, што, ідучы ў разведку, не задумваючыся возьме з сабой усіх семярых.

**М.ШЫРЫНКІНА,**
**мастацкі кіраўнік культурнага цэнтра ГДУ, член аргкамітэта МФМ "Арт-сесія".**

**Фота У.Чысціка.**

## У вольны час

# АБ ВЕЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

Мы знаходзімся пад цяжарам сённяшніх праблем, выкліканых крызісам і ў эканоміцы, і ў іншых сферах нашага жыцця. Але, як заначаў вядомы паэт, душа чалавека "павінна працаваць" заўсёды, нягледзячы ні на якія матэрыяльныя складанасці. Праз духоўнае і ўзвышанае, праз мастацтва мы будзем адчуваць сябе людзьмі заўсёды.

З такой думкай сабраліся нядаўна ў студэнцкім кафэ універсітэта выкладчыкі філалагічнага, матэматычнага, фізічнага факультэтаў на сустрэчу з маладымі артыстамі абласнога драмтэатра. У шчырай і сяброўскай атмасферы ішла размова аб сённяшнім жыцці, выконваліся ўрыўкі са спектакля па творах Гогаля, гучалі музыка і песні.

Такія сустрэчы, калі побач з табой людзі, што цябе разумеюць, у наш час асабліва каштоўныя. Цеплыня чалавечых узаемаадносін усяляе надзею і веру толькі ў самае лепшае.

**(Наш кар.)**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- усеагульнай гісторыі -- дацэнта;
-- англійскай мовы -- выкладчыка;
-- эканомікі і кіравання вытворчасцю -- дацэнта;
-- рускай мовы для замежных навучэнцаў -- асістэнта /4/;
-- агульнай фізікі -- дацэнта;
-- хіміі -- дацэнта;
-- фізвыхавання -- старшага выкладчыка;
-- геаграфіі -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЗАНЯТКАЎ ПА КУРСУ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"

**(Працяг. Пачатак у №№14,15).**

### СЕМІНАР 14. БЕЛАРУСЬ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ЧАС РАСІЙСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1905-1907 гг. СТАЛЫПІНСКАЯ АГРАРНАЯ РЭФОРМА (4 гадзіны)

1. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання ў пачатку стагоддзя.
2. Утварэнне палітычных партый на Беларусі.
3. Асноўныя падзеі рэвалюцыі 1905-1907 гг.

4(1) Сталыпінская аграрная рэформа і яе значэнне.

5(2) Развіццё сельскай гаспадаркі ў пачатку XX ст.

6(3) Стан прамысловасці.

7(3) Рынaчная эканоміка на Беларусі ў пачатку XX ст.

#### ЛІТАРАТУРА:

Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг. Мн., 1983 г.

Близнец Г.И. Социальные революции в мире в нач. XX века. Гомель, 1992 г.

Непролетарские партии в России. Спецкурс по политической истории XX века. Выпуск первый. // Под общей редакцией доц. Энтина. Гомель, 1990 г.

Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции. Ч.II. У истоков политического противостояния. Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. // Под общей редакцией д.и.н., профессора Э.М.Энтина. Гомель, 1993 г.

Аверх А.Я. Столыпин и судьбы реформ в России. М., 1991 г.

Липинский Л.П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн.,1978 г.

Абергауз З.Е. Рабочий класс Белоруссии в нач. XX века. (1900-1913 гг.).

Эканамічная гісторыя Беларусі. С.122-136.

### СЕМІНАР 15. БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА ПАЧАТКУ XX СТ.

1. Уздым нацыянальнага руху падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Газеты "Наша доля" і "Наша ніва".
2. Развіццё адукацыі і навукі.
3. Мастацкая літаратура, выяўленчае мастацтва, архітэктура, тэатр.

#### ЛІТАРАТУРА:

Забаўскі М.М. Грамадска-палітычная барацьба ў сувязі з увядзеннем земства ў Беларусі.// Весці АН БССР. сер.грам.навук, 1987 г.

Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг. Мн., 1983 г.

Бич М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883-1903 гг. Мн., 1973 г.

Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Мн., 1977 г.

Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.II. У истоков политического противостояния. Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь.//Под общ.ред.д.и.н., профессора Э.М.Энтина, Гомель, 1993 г.

Шибеко З.В. Минск в конце XIX -- нач. XX в. Мн., 1985 г.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 года. Мн., 1984 г.

Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд Ч.I. Мн., 1977 г.

Гісторыя мастацтва Беларусі. Т.1-4.Мн., 1978 г.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т.1-5 Мн., 1984-1987 гг.

Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Мн., 1977 г.

### СЕМІНАР 16. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І РАСІЙСКІХ РЭВАЛЮЦЫЙ 1917 г.

1. Падзеі першай сусветнай вайны на Беларусі. Палітыка нямецкіх акупацыйных улад.
2. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Расклад палітычных сіл.
3. Кастрычніцкі пераварот на Беларусі.

#### ЛІТАРАТУРА:

Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі. Вып. 1. Мн., 1992 г.

Бобков А.М. Ограбление кайзеровской Германией наемных богатств Белоруссии в годы первой мировой войны.//Вопросы истории. Межведомственный сборник. Мн., 1988 г.

Непролетарские партии России в июне 1907-феврале 1917 гг. Материалы и документы по политической истории XX века. Выпуск II. Под общей редакцией доцента Энтина Э.М. Гомель, 1991 г.

Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986 г.

Игнатенко И.М. Октябрь без краски //Беларуская думка. 1993 г. №11. Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции. Ч.1, II, III. Гомель, 1993 г.

### СЕМІНАР 17. СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ.

1. Нацыянальны рух у 1917 г.
2. Германская акупацыя Беларусі. Абвяшчэнне БНР.
3. Барацьба за ўтварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі. Стварэнне ССРБ.
4. Першы з'езд Саветаў Беларусі. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР.

#### ЛІТАРАТУРА:

Дакументы: Пратакол дэлегатаў Усебеларускага з"езда 18 снежня 1917 года. -- В кн.: Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.III. Хрестоматия по истории общественных движений и политических партий. Гомель, 1993 г. -- С.191-193.

Устаўныя: Уступныя граматы да народаў Беларусі. Уступная грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. -- Беларускі гістарычны часопіс. 1993 г. N1. С.70-71.

Временного Революционного Рабоче-крестьянского правительства Белоруссии. -- Хрестоматия...

Декларация о провозглашении независимости Советской Социалистической Республики Белоруссии. -- Хрестоматия.

Платов Р. Сташкевич Н. К вопросу о становлении национальной государственности. -- В кн.: Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Часть II. Гомель, 1993 г. С.91-192.

Калубовіч А. Крокі гісторыі. Вільня. Менск, 1993 г. с.92-131.

### СЕМІНАР 18. БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ І ПОЛЬСКАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ

1. Прычыны грамадзянскай вайны і расстаноўка палітычных сіл на Беларусі.
2. Польская акупацыя Беларусі. Антыпольскі партызанскі рух.
3. Рыжскі мірны дагавор і яго антыбеларускі характар. Вынікі грамадзянскай вайны.

#### ЛІТАРАТУРА:

В огне гражданской войны. О революционных событиях в Белоруссии в 1917-1920 гг. Мн., 1989 г.

Дидиат Г.Л. Советско-польская война 1919-1920 гг.//Военно-исторический журнал. 1990 г. №5.

Юхо Я.А. Беларускія ўрады 1918-1920 гг. і іх паўнамоцтвы. //Беларускі гістарычны часопіс. 1993 г. N4.

Мацко А.Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918-1932 гг). Мн, 1972 г.

Какурин Н.Я. Как сражалась революция. В двух томах. М., 1990 г. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции... Ч.II.

**(Працяг будзе.)**





# ... ЗНАЙСЦІ ПРАВІЛЬНЫ КАМЕНЬ ...

**/Аб творчасці групы "Науцілус-Пампіліус"/**

**З**оркі на нашым айчынным небасхіле ўспыхваюць не часта. Ды і не заўсёды музыканты, якія дасягнулі поспеху, прадстаўляюць нешта арыгінальнае, з'яўляюцца яскравым прыкладам і прыкметнай з'явай у мастацтве. З групай "Науцілус-Пампіліус" было некалькі інакш: ужо літаральна з першага альбома пачалася ўсесаюзная слава, з'явілася магчымасць гаварыць аб іх як аб "камандзе" з незвычайным творчым крэда, новымі прыцягальнымі вобразамі песень. Прафесіяналізм выканання, добра прадуманы імідж, выдатна выкананыя і арыгінальна пабудаваныя песні -- усё гэта было новым і забяспечыла поспех групы. Група спадабалася многім. А працяглыя гастролі па краіне толькі надалі "Науцілусу..." яшчэ больш папулярнасці. Слава расла нібыта снежны камяк, ды гэта і не дзіўна: з яе прыходам на рок-сцэну слухач атрымаў магчымасць бачыць не ўстарэлы "ура-патрыятычны", а новы прыцягальны і добра пазнавальны вобраз. Гэтага вобраза і не хапала слухачу на працягу доўгага часу... Герой песень "Науцілуса" -- гэта, як правіла, малады і дастаткова ўпэўнены ў сабе і сваіх сілах юнак, якому надакучыла шэрае, размеранае і строга разрэгламентаванае жыццё, аднастайнасць паўсядзённасці і ўбогі стандарт у быце. Ён стаміўся ад аднастайнасці і паўтору, яго разумовыя здольнасці, патрабаванні некалькі завышаны ў параўнанні з патрэбамі натоўпу. Яго гоніць гэты натоўп, ды і ён, бадай, наўрад ці неабходны яму. Нешчаслівае каханне і поўнае неразуменне з боку акаляючых пададзены ў тэкстах групы з пэўнай доляй мінорнасці, што і паслужыла ў выніку павелічэнню папулярнасці групы: у слухача стваралася адчуванне меланхоліі з лёгкай прымессю смутку і безвыходнасці, немагчымасці штосьці змяніць да лепшага. Галоўны герой, як чалавек рашучы і натура дзейсная, у якога слова не разыходзіцца са справай, пакутліва шукае выйсце са складанай сітуацыі, якая пры бліжэйшым і больш скрупулёзным разглядзе з'яўляеецца тупіковай:

*...но я хочу быць с тобой,*
*и я буду с тобой!..*

Гэта крэда, гэтыя сімвалы і вобразы былі абавязковымі для першых альбомаў групы. Захаваліся яны ў іх творчасці і па сённяшні дзень. На працягу дастаткова доўгага часу гэта тэма распрацоўвалася і ў творчасці групы, і ў творчасці асобных музыкантаў, якія выпускалі свае сольныя альбомы /пласцінка "Другі" Дзмітрыя Умецкага. -- Заўвага П.Б./. На апошнім дыску, які называецца "Чужая зямля", мы сустракаемся з тымі ж героямі, што і ў ранніх работах, хаця тэхнічны бок увасаблення ў "вініле" гэтых песень проста выдатны. У тым немалая заслуга работнікаў фірмы "ЮСТ", што выпусціла гэты дыск, які выгадна адрозніваецца ад выпускаемай раней прадукцыі фірмы "Мелодыя". Усе 10 песень, якія ўвайшлі ў пласцінку, строга індывідуальныя. Але, тым не менш, ствараецца мазаічная карціна, складзеная з 10 "каменьчыкаў", што дазваляе гаварыць аб гэтым дыску як аб добра прадуманым выяўленчым палатне. Нягледзячы на тое, што рэкламная кампанія ў мэтах папулярызацыі пласцінкі практычна не вялася, дыск атрымаўся выдатным і адразу знік з прылаўкаў магазінаў, хаця кошт яго быў высокім.

Дыск адкрывае песня "Мангольскі стэп" з вельмі характэрнымі інтанацыямі ў гукавым палатне і не менш спецыфічным тэкстам. Містыцызм і таемна-рамантычныя вобразы аб'ядноўваюць у адзіны блок песні "Чысты Бес", "Прагулкі па вадзе", "Бесы" і "Марскі змей". У іх дастаткова моцныя біблейскія матывы і сюжэтныя пабудовы, што з'яўляецца цікавай навацыяй у творчасці "Науцілуса". Поўны безвыходнасці і фатальнага прадвызначэння тэкст песні "Гэтыя рэкі". Нягледзячы на, здавалася б, вузкасць паказваемага, гэта песня поўная тыповых і добра пазнавальных рысаў нашага часу і характэрных для групы абагульненняў. За дробным і агідным накідам з карціны неўпарадкаванага быту, шэрай паўсядзённасці і трывіяльнасці ў адносінах да рэальнасці, хаваецца адна з самых страшных і небяспечных з'яў нашага жыцця -- раўнадушша:

*Васька-кривой зарезал*
*трёх рыбаков*
*Отточенным обрезком*
*штыря,*
*Вывернул карманы и*
*набрал серебром*
*Без малого четыре рубля...*
*Вывернул рюкзак и нашел*
*в рюкзаке*
*Пол-бутылки дрянного*
*вина.*
*Выпил вино и уснул на*
*песке*
*Стала красной речная*
*волна.*
*Эти реки*
*текут "в никуда",*
*Текут никуда не впадая...*

Наступны блок песень -- гэта лірычныя балады з выдатнымі гітарнымі партыямі, з разгорнутымі акустычнымі сола і жорсткай, амаль хард-рокавай, рытмікай. Сярод іх "Лятучая мышь", "На беразе безымяннай ракі" і песня, якая дала назву альбому, -- "Чужая зямля". Тры названыя песні падводзяць нас да думкі аб тым, што мы -- толькі нікому не патрэбныя вандроўнікі на гэтай зямлі, якая з'яўляецца чужой усім нам. Горад, урбанізацыя -- самае страшнае зло, прадстаўленае ў выглядзе нейкага монстра, які паглынае і забівае ўсё лепшае ў чалавечых душах. Смутак, фаталізм, безвыходнасць тэкстаў толькі ўзмацняецца паўторнымі рыфамі гітар і жорсткай па саунду рытм-секцыяй.

Наогул альбом атрымаўся яркім, цудоўна аранжыраваным з мноствам гітарных сола і характэрнай, тыпова "наутиловской изюминкой" ва ўсім запісаным матэрыяле. Развіццё класічных традыцый і наватарства ў падачы "вечных" тэм дазваляе гаварыць аб тым, што "Науцілус" запісаў яшчэ адзін альбом, які павінен быць у калекцыі кожнага паважаючага сябе меламана

**П.БЕСЯЦКІ, вядучы рубрыкі "Лідэр".**

**Нагадваем нашым чытачам, што яны могуць падаваць свае заяўкі на публікацыі матэрыялаў аб той ці іншай замежнай або айчыннай групе, асобных спеваках вядучаму рубрыкі -- асістэнту кафедры рускай літаратуры Паўлу Бесяцкаму асабіста або па тэлефоне 56-32-40.**

## АСЕННІЯ МАТЫВЫ



ТУМАННАЯ РАНІЦА

## Вясёлы перапынак

## МІНІ-АНЕКДОТЫ

Студэнт звяртаецца да прафесара:

-- Вы згодны, што экзамен -- гэта латарэя?

-- У нейкай ступені...так.

-- Тады, можа, мне цягнуць не білет, а адразу адзнаку?

◆ ◆ ◆

Выкладчык пытае ў студэнта:

-- Чаму вы спіце на лекцыі?

-- Шкада траціць час ноччу, -- адказвае студэнт.

## НАВІНЫ ПЕРАДРЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІКІ

У сувязі з павелічэннем тэмпаў інфляцыі, фабрыка Дзяржзнак перайшла на паскораны выраб грашовых знакаў. Цяпер на купюрах друкуецца толькі арнамент і асноўныя подпісы, а намінальны кошт спажывец прастаўляе самастойна.

# СНІД НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЎСІХ!

### / 1 СНЕЖНЯ ПРАВОДЗІЦЦА СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ПРАФІЛАКТЫКІ СНІДу ПАД ДЭВІЗАМ "СНІД І СЯМ'Я" /

На зямным шары вірусам СНІДу ўжо заражаны больш 14 млн. чалавек, памёрлі ад гэтай хваробы больш 2,5 млн. чалавек.

На 31 сакавіка 1994 г. у 44 краінах Еўропы зарэгістравана больш 100 тысяч выпадкаў СНІДу.

У Рэспубліцы Беларусь на 1 ліпеня 1994 г. колькасць выяўленых ВІЧ-інфіцыраваных склала 103, у тым ліку ў Гомельскай вобласці -- 9, з іх двое дзяцей. У Беларусі памёрла 6 ВІЧ-інфіцыраваных, з іх два -- у нашай вобласці.

Хваля эпідэміі захліснула мільёны людзей, і мільёны яшчэ стаяць перад тварам пагрозы. Палова зноў інфіцыраваных -- жанчыны. Расце інфекцыя сярод жанчын і дзяцей, народжаных імі. Назіраецца злавесны рост інфіцыраваных пры звычайных сексуальных кантактах паміж мужчынай і жанчынай.

### Хворы на СНІД і родныя

Дакладна даказана, што вірус СНІДу не перадаецца ад хворага чалавека здароваму пры звычайных бытавых умовах. Хворым на СНІД патрэбна псіхалагічная падтрымка, павышаная ўвага, больш шчадныя адносіны, дадатковыя духоўныя намаганні з боку родных або блізкіх людзей.

### Жанчына і СНІД

Мужчыны і жанчыны падвяргаюцца аднолькавай рызыцы заражэння ВІЧ, але ў многіх адносінах жанчыны больш уразлівы.

Гэта неабходна ведаць кожнай жанчыне!

Вірус СНІДу перадаецца трыма спосабамі:

-- палавым шляхам;

-- праз неабеззаражаныя шпрыцы, іголкі, іншыя колюча-рэжучыя інструменты;

-- ад заражанай маці дзіцяці -- у час цяжарнасці і родаў, пры кармленні грудным малаком.

Найбольшай небяспецы жанчыну падвяргаюць мужчыны-бісексуалы.

### Муж, жонка і СНІД

Складана будаваць узаемаадносіны паміж мужам і жонкай, адзін з якіх інфіцыраваны ВІЧ. Інфіцыраваны павінен своечасова сказаць аб выніках аналізаў і дакладна ўяўляць сабе небяспеку ўступлення ў інтымны кантакт з заражаным чалавекам. Неінфіцыраваны /муж або жонка/ павінен абавязкова прайсці абследаванне на СНІД. Далейшыя ўзаемаадносіны мужа і жонкі дапамагае азначыць урач, які назірае ВІЧ-інфіцыраванага.

### Жаніх, нявеста і СНІД

У некаторых краінах спрабавалі ўзаконіць абследаванне на СНІД усіх жаніхоў і нявест, але хутка ад гэтага адмовіліся. Ключ да рашэння праблемы прафілактыкі СНІДу -- не ў абавязковай праверцы людзей, уступаючых у шлюб, а ў іх паводзінах. У асобных краінах будучых мужа і жонку абследуюць на СНІД. У нас такое абследаванне пры жаданні або па патрабаванню аднаго з маладых можна прайсці ананімна ў любой паліклініцы або Цэнтры прафілактыкі СНІДу як да, так і пасля вяселля.

### Гэта неабходна ведаць кожнаму!

Дзе СНІД, там гора і пакуты, паламаныя лёсы і няздзейсненыя надзеі; дзеці, асуджаныя на хуткую смерць. Так, любы чалавек можа заразіцца СНІДам. Але ў той жа час любы разумны чалавек надзейна пазбяжыць заражэння, калі будзе:

-- памятаць шляхі перадачы СНІДу;

-- весці здаровы лад жыцця;

-- мець адзінага і вернага палавога партнёра.

Правільнае прымяненне прэзерватываў істотна памяншае верагоднасць заражэння СНІДам.

Па пытаннях кансультавання і абследавання на СНІД звяртайцеся ў абласны Цэнтр прафілактыкі СНІДу. Наш адрас: г.Гомель, вул. Сожская, 1.

Тэл. 53-71-40, 3-43-23.

Мы працуем штодзённа з 18 да 22 гадзін, акрамя суботы і нядзелі.

**ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР ПРАФІЛАКТЫКІ СНІДу.**
**БЕЛАРУСКА-ГАЛАНДСКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР ЗДАРОЎЯ.**

Калектыў дэканата завочнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне метадысту **МАЛАШЧАНКА** Але Андрэеўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Калектыў бібліятэкі выказвае глыбокае спачуванне бібліёграфу 1 катэгорыі **КАНДРАЦЕНКА** Галіне Хрысанаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Калектыў ІВЦ выказвае глыбокае спачуванне інжынеру-матэматыку 2-ой катэгорыі **МАРМІЛАВАЙ** Любові Фёдараўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар
Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ

Падпісана да друку 25.11.94.